*М.А.Яцэвіч*

# КАРПАРАТЫЎНЫЯ БІБЛІЯТЭЧНЫЯ СІСТЭМЫ І ІХ РОЛЯ Ў ФАРМІРАВАННІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСІ

Ніводная бібліятэка свету не з'яўляецца самадастатковым сацыяльным інстытутам у сэнсе набыцця і самастойнага стварэння ўсіх неабходных ёй інфармацыйных рэсурсаў. Асабліва гэта датычыцца бібліятэк постсавецкай прасторы, якія маюць значныя цяжкасці з фінансаваннем. Разам з тым, сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі дазваляюць аблегчыць гэтую праблему. Гэта адбываецца шляхам стварэння карпаратыўных бібліятэчных сістэм, якія грунтуюцца на адпаведных камп'ютэрных сетках і, якія дазваляюць аб'яднаць намаганні бібліятэк, адначасова размеркаваўшы паміж імі пэўныя накірункі дзейнасці. Арганізацыйна гэта можа прывесці да ўзнікнення адпаведных кансорцыумных утварэнняў рознага ўзроўню.

Кансорцыум – гэта аб'яднанне бібліятэк і іншых інфармацыйных службаў для сумеснага фарміравання, стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў. Большасць з кансорцыумаў з'яўляюцца недзяржаўнымі, некамерцыйнымі арганізацыямі. Яны грунтуюцца на прынцыпах дабравольнасці і адказнасці і імкнуцца стварыць эфектыўную бібліятэчна-інфармацыйную інфраструктуру.

Перспектывы развіцця бібліятэчнай справы Беларусі, несумненна, таксама звязаны з развіццём кансорцыумных утварэнняў на базе карпаратыўных АБІС і іх міжсеткавым ўзаемадзеяннем. Іх прызначэнне заключаецца ў аб'яднанні намаганняў бібліятэк (і іншых інфармацыйных службаў) з мэтай эканоміі фінансавых сродкаў, акупнасці выдаткаў, змяншэння рызыкі ад сумеснага стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў. Фінансавы выйгрыш ад такога ўдзелу ў іх можа быць дасягнуты таксама праз істотную эканомію затрат на комплексную аўтаматызацыю пэўнай бібліятэкі і ўваходжанне яе ў нацыянальную і міжнародную інфармацыйную прастору.

Першым бібліятэчным кансорцыумам прынята лічыць OCLC, які быў створаны ў ЗША ў 1967 г. Стварэнне OCLC, як вядома, пачалося з таго, што 54 бібліятэкі каледжаў і універсітэтаў штата Агайо аб'ядналіся ў бібліятэчны цэнтр з мэтай пабудовы рэгіянальнай бібліятэчнай сеткі для сумеснага стварэння і выкарыстання электронных каталогаў. Сёння OCLC з'яўляецца самай магутнай бібліятэчна-інфармацыйнай сеткай не толькі ЗША, але і свету [10].

Спачатку бібліятэчныя аб'яднанні ўзнікалі як грамадскія арганіза-

цыі, ствараліся ў асноўным па тэрытарыяльнай прыкмеце і не называліся кансорцыумамі. Толькі ў пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя яны сталі называцца кансорцыумамі, а на першы план іх дзейнасці выйшлі дзве асноўныя эканамічныя задачы: 1) дамовіцца з выдавецтвамі аб найлепшых умовах атрымання дарагіх электронных выданняў і атрымаць максімальную эфектыўнасць ад іх сумеснага выкарыстання (купляецца адзін раз – выкарыстоўваюць усе удзельнікі); 2) ствараць карпарытыўныя інфармацыйныя прадукты і паслугі (ІПП), якія б выступалі ў якасці тавару на інфармацыйным рынку (пры гэтым эканомяцца грашовыя сродкі, найбольш рацыянальна выкарыстоўваюцца чалавечыя рэсурсы і магутнасці аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм, з'яўляецца магчымасць сеткавага ўзаемадзеяння і г.д.).

Найбольш вядомыя выдавецтвы (Elsevier, Springer, Academic Press, Ovid) і іншыя пастаўшчыкі БД маюць для бібліятэчных кансорцыумаў ільготныя схемы цэнаўтварэння на свае электронныя рэсурсы. Пры гэтым звычайна яны выстаўляюць наступныя ўмовы: кантракт на тры гады; падпіска на папяровыя і электронныя версіі (у якасці базавай бярэцца цана на папяровую версію з нацэнкай у працэнтах на электронную; пры набыцці некалькіх экземпляраў – значныя скідкі); магчымасць доступу да ўсіх БД, калі набываецца пэўная колькасць папяровых выданняў; улік інфляцыі; немагчымасць адмовіцца ад часткі заказу; забеспячэнне доступу да электронных выданняў усіх членаў кансорцыуму [5]. Аднак, заўважым, што ў сувязі з абмежаванымі фінансавымі магчымасцямі, бібліятэкі наўрад ці змогуць дазволіць сабе раскошу працаваць адначасова і з друкаванымі, і з электроннымі версіямі часопісаў.

Шырокае распаўсюджанне бібліятэчныя кансорцыумы атрымалі ў ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Францыі, Нідэрландах, Даніі, Грэцыі, Венгрыі, Паўднёвай Афрыцы і іншых краінах свету. Ёсць вопыт стварэння кансорцыумаў і ў Расіі (3,7,8; секцыя «Карпаратыўныя бібліятэчныя сістэмы» у матэрыялах «Крымскіх канферэнцый»). У 1997 г. створана Міжнародная асацыяцыя бібліятэчных кансорцыумаў, якая аб'ядноўвае звыш 60 такіх утварэнняў.

Звычайна называюцца чатыры асноўныя віды бібліятэчных кансорцыумаў [5]: «мягкая федэрацыя», «жорсткая федэрацыя», «шматмэтавы кансорцыум», «кансорцыум з цэнтралізаваным фінансаваннем («бюракратычны»)». Такая класіфікацыя запазычана з замежных крыніц і з'яўляецца не зусім карэктнай, таму што ў ёй змешаны розныя прыкметы. Больш лагічным падаецца фасетны падыход, з выдзяленнем пэўнага класу агульных прыкмет. Пры такім падыходзе можна выдзеліць наступныя прыкметы для класіфікацыі кансорцыумаў.

Па *спосабе адміністрыравання* і *фінансавання* яны могуць быць *цэнтралізаванымі* (будавацца «зверху»), *дэцэнтралізаванымі* («знізу») і *змешанымі*. Аснову іх жыццядзейнасці складаюць адпаведныя віды фінансавання.

*Цэнтралізаваныя* кансорцыумы адрозніваюцца жорсткай структурай пабудовы, цэнтралізаванай адміністрацыяй, якая з'яўляецца часткай дзяржаўнай ці камерцыйнай структуры, якія фінансуюць набыццё інфармацыйных прадуктаў і аказанне адпаведных паслуг. Яны могуць ствараца як на нацыянальным, рэгіянальным, так і ведамасным узроўнях. Цэнтралізаваная адміністрацыя вызначае бюджэт кожнага з удзельнікаў кансорцыума. Такі падыход з'яўляецца тыповым, напрыклад, для Фінляндыі, Швецыі, Нарвегіі, дзе прыняты цэнтралізаваныя нацыянальныя праекты электронных бібліятэк (доступ да электронных выданняў) з выдзяленнем спецыяльных грантаў урадамі гэтых краін [4, 9]. Па такім прынцыпе (з пераважна дзяржаўным фінансаваннем) дзейнічаюць таксама і дзве карпаратыўныя сеткі Францыі: сетка Нацыянальнай бібліятэкі і ABES [3]. Поўнасцю камерцыйнай фірмай з'яўляецца знакамітая OCLC [10].

*Дэцэнтралізаваныя* кансорцыумы будуюцца «знізу» ад бібліятэк і ўжо заключаных кааператыўных пагадненняў і не маюць цэнтралізаванай адміністрацыі і фінансавання, абавязковых патрабаванняў да таго, хто можа быць членам кансорцыума. Існуе магчымасць адмовы ад сумеснага вядзення зводнага каталога ці набыцця пэўнай базы даных, калі адзін з удзельнікаў не збіраецца яе выкарыстоўваць (напрыклад, кансорцыум публічных бібліятэк г. Нью-Йорка). Узаемаадносіны ў такіх кансорцыумах фіксуюцца рэгулярнымі фінансавымі дамовамі паміж іх удзельнікамі, у якіх вызначаюцца канкрэтныя віды работ, інфармацыйныя паслугі і г.д.

Цэнтралізаваная пабудова кансорцыума можа не заўсёды задавальняць асобныя бібліятэкі, таму часта выкарыстоўваецца «змешаны» падыход, як, напрыклад, у кансорцыумах DEF Даніі [4], PICA Нідэрландаў, CURL Вялікабрытаніі [3] і інш. На першым этапе іх развіцця яны мелі статус беспрыбытковых арганізацый, а фінансавую аснову такіх кансорцыумаў складала прамая дзяржаўная падтрымка. Цяпер яны фінансава незалежныя і самастойныя. Іх прыбыткі складаюцца з наступных крыніц: членскія ўзносы ўдзельнікаў; продаж інфармацыі іншым спажыўцам; прадстаўленне разнастайных паслуг па інфарматызацыі; рэалізацыя інфармацыйных праектаў унутры краіны і па-за яе межамі. Дзяржава можа часткова прадаўжаць фінансаванне найбольш значных праектаў. Разам з тым, на сусветным інфармацыйным рынку даволі прыкметна тэндэнцыя трансфармацыі кансорцыумаў з беспрыбытковых арганізацый ў звычайную камерцыйную фірму тыпу OCLC, RUN, SOLINET, PALINET.

«Змешаны» характар кансорцыума праяўляецца не толькі ў залежнасці ад крыніц яго фінансавання, але і ад віду ўдзелу (членства) у ім. Яно можа быць *поўным, асацыіраваным і каапераваным.*

*Поўнае членства* азначае гатоўнасць перадаць копіі ўсіх сваіх электронных запісаў для ўключэння ў БД кансорцыума і ў абмен атрымаць права выкарыстоўваць запісы з БД бясплатна, у адпаведнасці з пагадненнем.

Прадстаўляецца таксама права наведваць усе мерапрыемствы, галасаваць, прапаноўваць, вылучаць і быць выбраным членам савета дырэктараў кансорцыума. Для поўнага членства неабходна, каб бібліятэка адпавядала шэрагу крытэрыяў, сярод якіх найбольш важнымі з'яўляюцца: нацыянальная ці міжнародная рэпутацыя бібліятэкі-кандыдата; трывалыя магчымасці штогадовых фінансавых выдаткаў на ўзносы, падпіску (у любой форме), набыццё БД і г.д. (і не менш за той узровень, які вызначыць савет дырэктараў); наяўнасць сучасных АБІС і сродкаў тэлекамунікацый; дастаткова высокая ступень тэхналагічнай дысцыпліны ў бібліятэцы-прэтэндэнтцы і ўзровень навуковых даследаванняў, наяўнасць атрыманых грантаў і інш. Усё гэта, на думку савета дырэктараў, зробіць магчымым унесці пэўнай бібліятэцы значны ўклад у работу кансорцыума.

У якасці *асацыіраваных удзельнікаў с*авет дырэктараў можа запрасіць тыя бібліятэкі, якія не могуць прадставіць для кансорцыума каштоўныя БД, але могуць падтрымаць яго іншымі спосабамі ці ўнесці карысны ўклад у яго работу. Ім прадстаўляецца права наведвання (без галасавання) пасяджэнняў дырэктарата, а таксама галасаваць у рабочых групах, падкамітэтах ці іншых падраздзяленнях кансорцыума. Але выкарыстанне БД для асацыіраваных членаў звычайна зўяўляецца платным. Узнос для іх складае, як правіла, не больш за палову ад членскага ўзносу «поўных членаў».

*Кааперыраванае членства* ажыццяўляецца шляхам запрашэння саветам дырэктараў тых устаноў, у якіх у наяўнасці электронныя запісы ці якія можна падрыхтаваць да ўключэння ў БД кансорцыума. У адказ прадстаўляецца прыярытэтнае права на імпарт запісаў, удзела (не галасуючы) у рабоце кіруючых органаў кансорцыума. Пры неабходнасці кааперыраваных членаў далучаюць да працы ў рабочых групах ці камітэтах. Памер членскага ўзносу для іх звычайна складае не больш 25 працэнтаў ад «поўнага» членства.

Па *ажыццяўляемых функцыях* (аспектах узаемадзеяння) мэтазгодна выдзеліць *монафункцыянальныя* і *поліфункцыянальныя* кансорцыумы. Першыя пакуль з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі і ствараюцца для рэалізацыі адной з наступных мэт: забеспячэнне доступу да электронных выданняў выдавецтваў (часцей за ўсё); ажыццяўленне цэнтралізаванай каталагізацыі (рэтраканверсіі) і падтрымкі зводных каталогаў; рэалізацыі ЭДД ці сумеснага стварэння поўнатэкставых БД і г.д. Другія (OCLC, SOLINET, PALINET) прадстаўляюць цэлы комплекс ІПП, маюць цэнтралізаваны каталог (напрыклад, OCLC), дазваляюць выкарыстоўваць усе інфармацыйныя рэсурсы, а не толькі тыя, што набыты ў рамках кансорцыума. Такія кансорцыумы кіруюцца адміністрацыяй, яго ўдзельнікі плацяць членскія ўзносы.

Па *тэматычнай прыкмеце* выдзелім кансорцыумы *галіновыя* і *міжгаліновыя*, якія аб'ядноўваюць бібліятэкі ў межах пэўных міністэрстваў і ведамстваў.

Па *геаграфічнай (тэрытарыяльнай)* прыкмеце кансорцыумы могуць быць *транснацыянальнымі:* OCLC; *нацыянальнымі*: RLIN, WLN у ЗША [10], PICA ў Нідэрландах [3], FINELIB у Фінляндыі, DEF у Даніі [4, 9]; *рэгіянальнымі*: ILLINET штата Ілінойс, CW/ MARS Library System штата Масачусетс, PIONEER штата Юта, OHIOLINC штата Агайо ў ЗША [10]; кансорцыумы бібліятэк Паўднёвага Уралу, Далёкага Усходу ў Расіі; *міжрэгіянальнымі*: MINITEX у ЗША [10]. Удзельнікамі такіх кансорцыумаў, як правіла, з'яўляюцца бібліятэкі розных тыпаў і відаў.

Па *тыпах бібліятэк-удзельніц* – кансорцыумы *публічных* бібліятэк: г. Нью-Йорка ў ЗША, г. Масквы ў Расіі [8]; кансорцыумы *універсітэцкіх* бібліятэк: CURL у Вялікабрытаніі, ABES у Францыі [3], кансорцыум універсітэцкіх бібліятэк г.Санкт-Пецярбурга ў Расіі [7] і інш. Як правіла, такія аб'яднанні ствараюцца без геаграфічных абмежаванняў. Кожная бібліятэка ўносіць сваю частку ў фінансаванне. Сумесна выкарыстоўваюцца толькі тыя інфармацыйныя рэсурсы, якія набыты ў рамках кансорцыума, астатнія – незалежна.

Зразумела, што пры пабудове кансорцыумаў могуць быць самыя розныя спалучэнні названых класаў прыкмет, напрыклад: тэрытарыяльных і тыпаў бібліятэк, тэматычных і па ажыццяўляемых функцыях, тэрытарыяльных і галіновых, цэнтралізаваных і поліфункцыянальных і г.д.

Стварэнне кансорцыума пачынаецца з адказу па меншай меры на наступныя шэсць груп пытанняў: 1) від кансорцыума і яго асноўныя задачы, склад ўдзельнікаў, іх геаграфічнае месцазнаходжанне; асаблівасці фінансавання і яго крыніцы; юрыдычны статус; кансорцыумныя дамовы і ліцэнзійныя пагадненні; 2) якія ІПП ужо ў наяўнасці і якія будуць стварацца і/ці выкарыстоўвацца сумеснымі намаганнямі; 3) якая будзе тэхналогія стварэння і выкарыстання ІПП усімі ўдзельнікамі; 4) ці ўсе ўдзельнікі маюць неабходныя тэхніка-тэлекамунікацыйныя сродкі для выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў; наколькі сумяшчальнымі ў бібліятэках-удзельніцах з'яўляюцца фарматы і пратаколы іх АБІС; 5) на якіх умовах і як будзе ажыццяўляцца ўзаемадзеянне са «знешнім контурам» (іншымі кансорцыумамі, асобнымі бібліятэкамі, інфармацыйнымі службамі, выдавецтвамі і г.д.) у сэнсе паставак сваіх ІПП і выкарыстання іншых; 6) якія яшчэ ўстановы могуць стаць членамі кансорцыума.

Дзейнасць кансорцыумаў базіруецца на карпаратыўных інфармацыйных сетках з выкарыстаннем сучасных сродкаў тэлекамунікацый. Карпаратыўная тэлекамунікацыйная сетка - гэта мноства бібліятэк, якія ажыццяўляюць некаторую сумесную працу (камплектаванне, каталагізацыю, інфармацыйнае абслугоўванне і г.д.) на аснове сетак перадачы даных, маюць, як правіла, агульныя вылічальныя рэсурсы (цэнтры) і магутныя сэрверы. Выкарыстоўваюцца самыя розныя пратаколы і каналы: ад камунікацыйных тэлефонных ліній да касмічных каналаў сувязі, платформы для Web-дадаткаў (напрыклад, Documentum 4i) [1], з дапамогай якіх

можна будаваць карпаратыўныя парталы для аб'яднання бібліятэк. Неабходна адрозніваць карпаратыўную бібліятэчна-інфармацыйную сетку ад адміністратыўнай сеткі. Апошняя - гэта мноства бібліятэк, якія маюць адзінае кіраванне і могуць мець узгодненыя дзеянні ў камплектаванні, каталагізацыі і г.д., пры гэтым зусім неабавязкова з выкарыстаннем камп'ютэрнай тэхнікі.

Практычна ўсе кансорцыумы пачыналі сваю дзейнасць з таго, што бібліятэкі-удзельніцы стваралі цэнтральны вылічальны цэнтр для агульных інфармацыйных рэсурсаў і напрамую злучаліся з ім па выдзеленых тэлефонных лініях («зорныя» схемы). З развіццём сродкаў тэлекамунікацый у пабудове карпаратыўных бібліятэчных сетак сталі выкарыстоўваць кальцавыя і іерархічныя структуры. Аднак да гэтага часу «зорныя» схемы застаюцца папулярнымі для рэгіянальных сетак. Напрыклад, Нью-Йоркская бібліятэчная сетка мае «зорную» схему падключэння (з выдзеленымі тэлефоннымі і валаконна-аптычнымі лініямі) да агульнага вылічальнага цэнтра ў горадзе і магутны шлюз ад яго ў Internet.

Замежны вопыт паказвае, што аплата бібліятэкамі за выкарыстанне цэнтральных БД, часцей за ўсё, ажыццяўляецца паасобна па адным ці ў камбінацыі наступных двух відаў: 1) плата за пошук (пошук лічыцца рэалізаваным, калі карыстальнік знаходзіць хаця б адзін запіс); 2) фіксіраваная штомесячная (гадавая) аплата за адзін ці некалькі каналаў доступу, якія выдзелены бібліятэцы (колькасць магчымых запытаў на працягу кантрактнага перыяду не абмяжоўваецца). Паслугі абанентам бібліятэкі па доступе ў нацыянальныя ці замежныя камерцыйныя БД, а таксама выкарыстанне МБА з дастаўкай дакумента па пошце ці яго электроннай копіі прадстаўляюцца толькі пры наяўнасці ў карыстальніка ILL-account (асабістага фінансавага рахунку міжнароднай сістэмы МБА). Арганізацыя, якая прадстаўляе такія паслугі пры запыце карыстальніка, кантралюе наяўнасць у яго рахунку, дастатковасць сумы грошай на ім і толькі пасля гэтага дазваляе карыстацца паслугай. Для доступу да камерцыйных электронных публікацый бібліятэкі павінны мець платную ліцэнзію, да астатніх камерцыйных БД аплата (за пошук) можа вагацца ад 5 да 20 долараў ЗША і таксама аплачваецца па ILL-account.

Інфармацыйнае ўзаемадзеянне ў рамках кансорцыума (і паміж імі) немагчыма без камунікатыўных фарматаў (канвертараў) і пратаколаў, якія дазваляюць аб'яднаць розныя АБІС бібліятэк. Найбольш сучасныя з іх падтрымліваюць некалькі абменных фарматаў (UNIMARC, USMARC, нацыянальны), пратакол Z39.50 і маюць «шлюз» у Internet. Дзякуючы ім удалося, напрыклад, у кансорцыуме універсітэцкіх бібліятэк г. Санкт-Пецярбурга аб'яднаць у адзінае цэлае розныя АБІС («МАРК», «ИРБИС», «Колибри», «RUSLANet») і ажыццяўляць інфармацыйны абмен [7].

Разам з тым, большасць замежных кансорцыумаў, асабліва рэгіянальных, аддае перавагу выкарыстанню ў яго рамках адной АБІС, якая можа

і набывацца сумеснымі фінансавымі намаганнямі. Яшчэ адной асаблівасцю фінансавай дзейнасці некаторых кансорцыумаў, напрыклад, PICA [3] зўяўляецца тое, што пры ўкараненні ў бібліятэкі сваёй АБІС плата бярэцца толькі за паслугі: арганізацыю ўкаранення і эксплуатацыі сістэмы (устаноўка і наладка тэхнічнага комплексу, навучанне персаналу, канверсія каталогаў, прадстаўленне БД і г.д.). Пастаўка самога ж праграмнага забеспячэння ажыццяўляецца бясплатна, таму што кансорцыум зацікаўлены ў пашырэнні кола яго ўдзельнікаў.

Найбольш якасныя замежныя АБІС (у т.л. і расійскія – «МАРК-SQL», «ИРБИС», «А-ЭЛИТА») падтрымліваюць карпаратыўны рэжым работы, ў рамках якога можна ажыццявіць рэгістрацыю бібліятэкі; стварыць як электронны каталог асобнай бібліятэкі, так і ЗвЭК бібліятэк горада, рэгіёна, краіны; прадстаўляць у карпаратыўны цэнтр і імпарціраваць бібліяграфічныя запісы, арганізаваць ЭДД у міжрэгіянальных маштабах, фізічны доступ да ЗвЭК праз Internet як па выдзеленым канале, так і з дапамогаю мадэма; правяраць сваё становішча ў кансорцыуме. Тэхналогія карпаратыўнай каталагізацыі і рэтраканверсіі, напрыклад, у АБІС «А-ЭЛИТА» ажыццяўляюцца наступным чынам. Спачатку з дапамогай Internet на цэнтральным сэрверы адбываецца рэгістрацыя бібліятэкі, якая ўступае ў кансорцыум і пераводзіць безнаяўным разлікам уступны ўзнос. Бібліятэкі перадаюць на цэнтральны сэрвер (ЦС) свае бібліяграфічныя запісы. ЦС ажыццяўляе праверку іх на дублетнасць, правільнасць запаўнення MARC-фарматаў, фармаціруе іх у адзіны MARC-фармат і стварае адзіную БД (мега-каталог). Апошні размяшчаецца на ЦС (калі доступ ажыццяўляецца праз Internet) ці перадаецца ў бібліятэку на CD-дысках для ўстаноўкі на сэрверы лакальнай сеткі кожнай бібліятэкі. Кожная бібліятэка праглядае мега-каталог і адзначае тыя бібліяграфічныя запісы, на якія ў яе ёсць выданні. На ЦС адсылаецца запыт на набыццё гэтых запісаў. ЦС правярае рэгістрацыю пэўнай бібліятэкі і перадае запатрабаваныя запісы. Любы з запісаў можа быць адрэдагаваны бібліятэкай і вернуты назад у мега-каталог. Пры абнаўленні запісаў адбываецца праверка на дублетнасць, яго пасімвальнае апісанне, а таксама на колькасць і склад палёў і падпалёў у MARC-фармаце і адпаведна надаецца аўтарства. Абмен інфармацыяй унутры кансорцыумаў ажыццяўляецца на базе пратакола Z39.50.

Кансорцыумы, якія б мелі свой юрыдычны статус, на жаль, яшчэ не знайшлі свайго распаўсюджання на Беларусі, хаця спробы іх стварэння былі. Так, у 1999 г. быў створаны кансорцыум бібліятэк для інтэрактыўнага доступу да 400 электронных версій навуковых часопісаў выдавецтва «Springer» (каардынатар праекту ЦНБ НАН Беларусі). Дзяржкамітэт па навуцы выдзеліў фінансавыя сродкі, але праект у той час так і не быў рэалізаваны з-за адсутнасці хуткасных тэлекамунікацыйных каналаў. У 2000 г. у рамках Навукова-даследчай камп'ютэрнай сеткі Беларусі быў

арганізаваны цэнтр Інтэрнэт-доступу да электронных часопісаў праз спадарожнікавую антэну [2]. У 2002 г. узніклі передумовы стварэння кансорцыума бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў, каля 15 з іх аб'ядналіся для сумеснага набыцця АБІС «МАРК-SQL». Ёсць добрыя магчымасці і напрацоўкі для стварэння кансорцыума публічных бібліятэк у рамках Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Гэта пакуль адзіная сетка бібліятэк, якая рэальна выкарыстоўвае карпарацыйны падыход да пабудовы аўтаматызаванай бібліятэчнай сістэмы, які заснаваны на спалучэнні прыкмет: пабудова «зверху» (дзяржаўнае фінансаванне) – галіна (ведамства) – тып бібліятэкі. Па рэгіянальнай прыкмеце ствараюць карпаратыўную інфармацыйную сетку бібліятэкі Гомельскай вобласці.

У апошнія гады шматлікімі спецыялістамі нашай краіны прапаноўваецца стварэнне цэнтра карпаратыўнай каталагізацыі, што адлюстравана ў арганізацыйных мерапрыемствах «Канцэпцыі інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк Беларусі». Адзін з магчымых падыходаў па стварэнні адпаведнай карпарацыі прапаноўваецца таксама ў рабоце Р.С.Мульскага [6], мэта якога бачыцца ім ў стварэнні «нацыянальнага банка бібліяграфічных запісаў (НББЗ), які павінен функцыянiраваць на камерцыйнай аснове» і аб'яднаць вядучыя бібліятэчна-інфармацыйныя ўстановы, у першую чаргу НКП і НББ, а затым і паранацыянальныя бібліятэкі. Аўтар прапаноўвае асноўныя напрамкі дзейнасці такой карпарацыі ў плане фарміравання НББЗ, з якімі ў цэлым можна пагадзіцца.

Вызывае толькі сумненне сцвярджэнне Р.С.Матульскага аб тым, што адпаведная «карпарацыя павінна дзейнічаць, як камерцыйная арганізацыя ...» і «прыбытак ад продажу бібліяграфічных апісанняў павінен стаць асноўнай крыніцай фінансавання яе дзейнасці». Не адвяргаючы ў тым ліку і камерцыйны падыход, думаецца, што ён не з'яўляецца рэалістычным па наступных прычынах. Па-першае, вопыт дзейнасці замежных кансорцыумаў, аб чым гутарка ішла вышэй, паказвае, што бібліяграфічная інфармацыя з'яўляецца не тым відам інфармацыйнага тавару, продаж якога дазволіць «выжыць» карпарацыі. Наадварот, доступ да бібліяграфічнай інфармацыі на сусветным інфармацыйным рынку у асноўным свабодны. Кансорцыумы сапраўды атрымоўваюць прыбытак, але ў пераважнай большасці ад паставак на рынак баз даных поўных тэкстаў дакументаў, праблемна-арыентаваных, фактаграфічных, аналітычных і г.д., якія з'яўляюцца камерцыйнымі. Прадаваць бібліяграфічныя запісы замежным карыстальнікам? Магчыма, але няпэўна, што яны зоймуць значны сегмент інфармацыйнага рынку, а іх продаж прывядзе да самаакупаемасці, што прапаноўваецца карпарацыяй. Па-другое, зноў-такі вопыт замежных краін сведчыць, што пераважная большасць нават буйных кансорцыумаў – гэта некамерцыйныя арганізацыі, якія актыўна падтрымліваюцца дзяржавай. Апошняя павінна зразумець, што мэтавая фінансавая падтрымка, напрыклад, арганізацыі цэнтра карпаратыўнай каталагі-

зацыі (з аднаразовым стварэннем бібліяграфічнага запісу і яго шматразовым і шматаспектным выкарыстаннем) дазволіць у рэшце рэшт сэканоміць тыя ж дзяржаўныя грошы.

Найбольш рэальным у цяперашніх умовах для Беларусі прадстаўляецца стварэнне нацыянальных некамерцыйных бібліятэчных кансорцыумаў (карпарацый) з цэнтралізаваным падыходам (скандынаўскі варыянт) са значнай на першым этапе дзяржаўнай падтрымкай, у першую чаргу для ажыццяўлення цэнтралізаванай электроннай каталагізацыіі, падтрымкі ЗвЭК, стварэння сваіх і доступу да сусветных поўнатэкставых баз даных. Неабходна як мага больш актыўна выкарыстаць спрыяльныя ўмовы, якія склаліся ў сувязі з будаўніцтвам новага будынку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і выдзяленнем адпаведных фінансавых сродкаў. НББ можа выступіць у якасці таго «цягніка», які здолее выцягнуць усю бібліятэчную справу краіны на якасна новы ўзровень і стварыць разам з паранацыянальнымі бібліятэкамі адзіную бібліятэчную камп'ютэрную сетку краіны - BelLibNet. Неабходна таксама больш актыўна выкарыстаць дзеля гэтага магчымасці Дзяржаўнай праграмы «Электронная Беларусь». Гэта зусім не азначае, што не трэба шукаць іншыя крыніцы фінансавання і, што паралельна не можа ажыццяўляцца рух «знізу», напрыклад, стварэнне рэгіянальных кансорцыумаў, па тыпах бібліятэк і г.д.

Пастаноўка ж у якасці прыярытэтнай камерцыйнай задачы на дадзеным этапе стварэння карпаратыўных бібліятэчных сістэм з'яўляецца дастаткова складанай у сувязі з тымі прычынамі, якія былі акрэслены вышэй. Акрамя таго, ў выпадку рэгістрацыі бібліятэчнага кансорцыума як камерцыйнага ўтварэння - яго чакае шмат наступстваў: нарматыўна-прававых, адміністратыўных, падатковых і інш.

Пры стварэнні бібліятэчных карпаратыўных сістэм неабходна таксама памятаць пра адмоўныя наступствы, якія звязаны з магчымым скарачэннем бібліятэчнага персаналу (напрыклад, пры стварэнні PICA бібліятэчны персанал быў скарочаны прыкладна на трэцюю частку [3]. Апошняе з'яўляецца вельмі значным і заслугоўвае спецыяльнага разгляду.

**Літаратура:**

1. Александров В.В., Николаев А.Ю. Методы и технология построения корпоративных информационных систем// Пробл. информатизации.- 2001.- № 3.- С. 37 - 39.

2. Березкина Н.Ю. Информационное обеспечение ученых в Центральной научной библиотеке НАН Беларуси//ИРР.- 2001.- № 1.- С. 25 - 26.

3. Библиотечно-компьютерные сети: Россия и Запад: Современные тенденции корпоративной работы библиотек в сетях передачи данных/ Ред.-сост Е.И.Кузьмин, М.Н.Усачев.– М.: Либерия, 1998.– 224 с.

4. Бьюрнехауг Л. Консорциумы по лицензированию, проекты национальной электронной библиотеки, централизация и/или кооперация// Науч. и техн. б-ки.- 2000.- № 9.- С. 86 - 90.

5. Класквин Ф.Ф. Тимофеева О.В. Информационно-библиотечные консорциумы и их роль в формировании национальных информационных ресурсов// НТИ.– Сер. 1.– 1999.– № 10.– С. 22 – 23.

6. Мотульский Р.С. Библиотечный фонд республики как национальная ценность/ /Бібліятэчны свет.– 2002.– № 1.– С. 23 – 26.

7. Пирог В.П. Технология организации библиотечного консорциума пяти университетов Санкт-Петербурга// Науч. и техн. б-ки.- 2001.- № 3.- 37 - 44.

8. Создание корпоративной сети публичных библиотек Москвы: эскизный проект.– М.: ГПНТБ, 1999 (http://corporate.gpntb.ru/eskiz.php).

9. Хаависто Т. Лицензирование и публичные библиотеки// Науч. и техн. б-ки.- 2001.- № 3.- С. 107 - 112.

10. Яцевич Н.А. Библиотечные компьютерные сети на информационном рынке США// Информационные технологии в библиотеках на рубеже веков: проблемы, поиски, решения: Материалы междунар. науч-практ. конф. (Минск, 20-22 октября 1998 г.). – Минск, 1999.– С. 35–41.

*Ю.Н.Макушинская*

# ФОРМИРОВАНИЕ ПРАВОВОЙ БАЗЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ БИБЛИОТЕК РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ (1991 – 2002 гг.)

В любом государстве процесс законотворчества вообще и применительно к той или иной сфере общественных отношений в частности осуществляется в определенных социально-политических условиях, при конкретных идеологических и культурных предпосылках. Только на основе анализа этих факторов можно объективно оценить эффективность тех или иных законодательных актов с точки зрения их необходимости и наиболее целесообразной формы правового регулирования соответствующих общественных отношений, достаточности или избыточности нормативного содержания этих документов. Внешними элементами, активно влияющими на деятельность библиотек, на формирование правовой базы деятельности библиотек и, в целом, на их правовое обеспечение, являются государственная культурная политика (внутренняя и внешняя) и государственная политика в сфере информатизации, влияние которых на деятельность библиотек Беларуси в целом наиболее существенно.

На протяжении длительного исторического периода развитие библиотечного дела Беларуси происходило в пределах разных государственных образований. Суверенная Беларусь имеет лишь 12-летний самостоятельный опыт в вопросах, связанных с законодательным регулированием деятельности библиотек.

Рассмотрение внешней культурной политики, фактора, влияющего на содержательное наполнение библиотечного законодательства, обусловлено, прежде всего, мировыми тенденциями интеграции и глобализации культур, когда процесс формирования библиотечного законодательства выходит за рамки отдельных государств.